**Вольга Ермаковіч,**
*БДУ, Мінск*

# ЛІТАРАТУРНЫЯ І ПАЗАЛІТАРАТУРНЫЯ КАМПАНЕНТЫ І ІХ УЗАЕМАДЗЕЯННЕ Ў ТВОРАХ ПРАДМОЎНА-ПАСЛЯСЛОЎНАГА КОМПЛЕКСУ КІРЫЛІЧНЫХ ВЫДАННЯЎ БЕЛАРУСІ ЭПОХІ БАРОКА

Спецыфіка культурнага і літаратурнага развіцця Беларусі XVI – XVII стагоддзяў была абумоўлена працэсамі секулярызацыі і гуманізацыі грамадства, звароту да разумовых і інтэлектуальных здольнасцей асобы. Гэта перыяд пераасэнсавання дзяржаўнай палітычнай думкі, уздыму нацыянальнай свядомасці, станаўлення і развіцця беларускага пісьменства. Ніколі раней літаратурнае слова не мела столькі свабоды і перспектыў для развіцця. І ніколі раней не было зроблена столькі важных адкрыццяў і вынаходніцтваў у розных галінах навукі, тэхнікі і мастацтва.

Слоўная культура XVI–XVII стагоддзяў, падпарадкаваная ідэям Адраджэння і Рэфармацыі, а пазней – ідэалогіі і стылістыцы Барока, заклала магутны падмурак для развіцця беларускай літаратуры на працягу некалькіх стагоддзяў. У барочнай эстэтыцы сумяшчалася несумяшчальнае: высокае і нізкае, розум і пачуцці, лёгкасць і напружанасць, рэальнасць і ілюзіі. Гэта дазволіла звычайнаму чалавеку адчуць сябе творцам, канчаткова пазбавіцца сярэднявечнага рабскага светаўспрымання, што ўсё яшчэ глыбока жыло ў чалавечай падсвядомасці. На хвалі ўсеагульнага ўздыму пачалі ўзнікаць новыя літаратурныя віды і жанры: сілабічная паэзія, мемуарыстыка, рэфармацыйная публіцыстыка, драматургія. Аўтары імкнуліся да філасофскага асэнсавання рэчаіснасці, занходзіліся ў няспынным пошуку новых сюжэтаў і ідэй. Працэс быў не лёгкім і не масавым, але галоўнае – творчая ўстаноўка – ужо існавала.

Абсалютна новай з’явай літаратуры XVI–XVII стагоддзяў стала з’яўленне спецыяльных літаратурных «элементаў афармлення» кірылічных друкаваных выданняў. Працягваючы традыцыі Францыска Скарыны і ствараючы новае, пісьменнікі звярталіся да новых літаратурных жанраў і ўжо існуючых, вядомых з часоў Антычнасці. Такімі элементамі сталі прадмовы, пасляслоўі, эпіграмы, прысвячэнні, малітвы, што змяшчаліся ў пачатку ці ў канцы пэўнага твора і выконвалі ролю аўтарскіх разваг, тлумачэнняў, стаўлення да рэлігійных і палітычных пытанняў. Сукупнасць дадзеных элементаў атрымала назву «прадмоўна-пасляслоўнага комплексу». Гэты тэрмін упершыню быў уведзены ў 1991 годзе Уладзімірам Георгіевічам Кароткім. «Як філолаг-наватар, Францыск Скарына ўвёў у кірылічнае кнігадрукаванне асобныя элементы прадмоўна-пасляслоўнага комплексу – прадмовы, пасляслоўі, калафоны. Пазней гэты пералік будзе дапоўнены як

пазалітаратурным кампанентам (выяваю фамільнага герба), так і вершам-эмблемай (эпіграмай), прысвячэннем, кананічнай ці свабодна выкладзенай малітвай», – піша У. Г. Кароткі [1, с. 200]. Творы, прыналежныя да прадмоўна-пасляслоўнага комплексу беларускіх кніжных выданняў XVI–XVII стагоддзяў, стварылі важны грунт для канцэптуалізацыі адметнай эстэтычнай прасторы ў кірылічным пісьменстве Беларусі. На сённяшні дзень грунтоўна вывучана толькі тая частка гэтай літаратурнай спадчыны, якая звязана з творчасцю Францыска Скарыны. Тым часам эпіграмы, прадмовы, прысвячэнні і пасляслоўі пазнейшага перыяду вывучаліся толькі спарадычна, не падлягалі сістэмна-кампаратывісцкаму разгляду.

Мала даследавалася еўрапейская традыцыя, звязаная з прадмоўна-пасляслоўным комплексам. Усе гэтыя пытанні даследуюцца на матэрыяле тых твораў, якія былі апублікаваны У. Г. Кароткім у кнізе «Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны» (Мінск, 1991) з выкарыстаннем навейшых даследаванняў па гісторыі беларускай літаратуры і кнігазнаўству. У навуковым выданні «Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны» даследчык прадставіў прадмовы і пасляслоўі Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Лявона Мамоніча, Мялеція Сматрыцкага. Да кожнага прадмоўна-пасляслоўнага элемента ў кнізе падаюцца навуковыя каментары, а ў дадатку факсімільна ўзнаўляюцца асобныя тэксты з рэдкіх выданняў.

Для таго, каб зразумець спецыфіку паняцця «прадмоўна–пасляслоўны комплекс», неабходна вызначыць, якія іменна кампаненты ў гэты комплекс неабходна ўключаць. Даследаванне беларускіх друкаваных кніг XVI – XVII стагоддзяў, праведзенае У. Г. Кароткім, дазваляе зрабіць наступную структурную класіфікацыю твораў гэтага комплексу: літаратурныя элементы – эпіграма, прысвячэнне, непасрэдная прадмова да кнігі, пасляслоўе-малітва, пасляслоўе. Таксама да вышэйпералічаных кампанентаў прымыкае яшчэ адзін, ужо нелітаратурны – герб-гравюра, дзе слоўная сімволіка заменена мастацка-выяўленчымі сродкамі. Да нелітаратурных элементаў адносіцца і арнамент, выкарыстаны для афармлення старонак друкаваных выданняў.

Прадмовы і пасляслоўі да кніг – з’ява не толькі перыядаў Адраджэння і Барока. Як своеасаблівыя літаратурныя жанры, яны існавалі яшчэ ў старажытнасці. Выконваючы ролю своеасаблівага звяна паміж аўтарам і карыстальнікам, прадмовы і пасляслоўі былі даволі важным кампанентам кніжнай культуры, які дапамагаў пашырыць сферу ўплыву на чытацкую аўдыторыю. Такім чынам, пашыраўся новы спосаб камунікатыўных зносін – з дапамогай друкаванай кнігі. Што тычыцца прадмоўна-пасляслоўнага комплексу кірылічных выданняў Беларусі, то гэтыя крыніцы дазваляюць прасачыць развіццё і станаўленне філасофскай, літаратуразнаўчай,

педагагічнай, рэлігійнай, гістарычнай плыняў ў канцы XVI – пачатку XVII стагоддзяў.

Асаблівую цікавасць уяўляе ўзаемадзеянне літаратурных і нелітаратурных элементаў. Калі наяўнасць тэкста дае магчымасць раскрыць сэнсавы змест пэўнага літаратурнага помніка, то наяўнасць друкаваных выяў (гербаў, арнаментальных уставак, малюнкаў з тытульнага ліста) дае магчымасць сфарміраваць уяўленне пра стыль і адметнасць пэўнай эпохі. Нелітаратурныя кампаненты надаюць канкрэтнасць і нагляднасць пэўнаму выданню, выдзяляюць яго з агульнай масы існуючай інфармацыі, дапамагаюць сфарміраваць чытачу больш поўнае пра яго ўяўленне.

Вялікую ролю адыгрывае наяўнасць нелітаратурнага кампанента – герба – у кірылічных выданнях, на старонках якіх змешчаны эпіграмы. Эпіграма як самастойны жанр была вядома яшчэ з часоў Антычнасці і ўяўляла сабою своеасаблівы надпіс-прысвячэнне на прадметах матэрыяльнай культуры, на сценах культавых пабудоў, алтарах, а таксама надмагіллях. З цягам часу эпігрматычная тэматыка пашырылася. Акрамя надмагільных, з’явіліся застольныя, эратычныя, сатырычныя, урачыстыя, любоўныя. Змянілася і манера іх «захоўвання». Эпіграма перастала быць надпісам і стала кніжным элементам. У Сярэднявеччы эпіграма аформілася змястоўна. Абавязковымі рысамі сталі: невялікі памер (як правіла, ад двух да дванаццаці радкоў) і набор антычных, а пазней і хрысціянскіх, сімвалаў і матываў. Эпіграма высмейвала, канстатавала, услаўляла. «У гісторыю старабеларускай літаратуры эпіграма ўвайшла перш за ўсё ў сваім “услаўленчым” значэнні – т. зв. “эпікграмы” на гербы знатных магнатаў (антычны праваобраз: невялікі афарыстычны зварот да агульнавядомай асобы з пажаданнем або ўсхваленнем)», – прыводзіць трапнае назіранне даследчыца Г. А. Карповіч [2, с. 40]. Прыкладна з XVI стагоддзя эпіграма стала пажаданым элементам прадмоўна-пасляслоўнага комплексу і мела, ак адзначае У. Г. Кароткі, па меншай меры два прызначэнні: гербатлумачальнае (больш распаўсюджанае) і дадактычна-асветніцкае (сустракалася значна радзей) [3, с. 8]. Эпіграмы на гербы былі папулярнымі элементамі кніжнай культуры. У сувязі з гэтым у літаратуразнаўстве існуе нават спецыяльны тэрмін – «геральдычны комплекс». У яго склад прынята ўключаць герб, апісанне яго паходжання, сімвалічны складнік і, непасрэдна, саму эпіграму.

Выявы гербаў, уключаныя ў геральдычны, а разам з ім і ў прадмоўна-пасляслоўны комплекс, давалі магчымасць чытачу пазнаёміцца з пэўным шляхецкім родам, яго гісторыяй.

Эпіграмы ўслаўлялі розум, сілу, справядлівасць пэўнага адрасата. Як адзначае даследчыца Г. А. Карповіч, «дабрачыннасць, выскароднасць, слава – вось мінімальны набор, які характарызаваў адрасатаў геральдычных панегірыкаў. Можна сказаць, што з эпіграмы ў эпіграму чытач сутыкаўся практычна з адным і тым жа чалавекам: мужным воінам, высакародным

шляхціцам, добрасумленным грамадзянінам, абаронцам веры і царквы» [2, с. 196].

У кірылічных выданнях існавалі і разнастайныя формы дэкаратыўнага арнаментальнага афармлення. Арнамент з'яўляўся своеасаблівым упрыгожваннем, элементам спецыфічнасці і адрозненасці. Асноўнымі месцамі змяшчэння гэтага нелітаратурнага складніка былі тытульныя лісты, пачатак і канец выданняў. Арнамент выконваў функцыю ўвядзення чытача ў атмасферу твора, садзейнічаў стварэнню пэўнага настрою, атмасферы.

Узаемадзеянне літаратурных і пазалітаратурных кампанентаў выводзіла друкаваныя кірылічныя выданні на новы ўзровень асэнсавання чытачом, давала магчымасць больш поўна і паглыблена ўспрыняць змест і ідэю твора.

**Літаратура**


1. Кароткі, У. Г. Беларуская літаратура і гісторыя / У. Г. Кароткі; навук. рэд. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткая. – Мінск, 2013. – 211 с.
2. Карповіч, Г. Кніжна-эпіграматычная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. у кантэксце антычнай традыцыі / Г. Карповіч. – Мінск, 2012. – 360 с.
3. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / АН БССР. Ін-т літ. імя Я. Купалы; уклад., уступ. арт. і камент. У. Г. Кароткага. – Мінск, 1991. – 309 с.